

ІНФАРМАЦЫЙНА — ВЫЛІЧАЛЬНЫ ЦЭНТР: ПОСПЕХІ І ПРАБЛЕМЫ

# ШЫРОКІ ДЫЯПАЗОН ДЗЕЯННЯ

**Сёння цяжка знайсці якую-небудзь галіну навукі і вытворчасці, у якой бы не выкарыстоўвалася вылічальная тэхніка. Складаныя разлікі, кіраванне няспыннымі тэхналагічнымі працэсамі, мабільныя і зручныя інфармацыйна-даведніцкія службы — вось далёка не поўны пералік паслуг, якія ЭВМ можа прапанаваць чалавеку.**

У нашым універсітэце вылічальная тэхніка з'явілася з самага пачатку яго існавання. Першай была ЭВМ другога пакалення — «Мінск-32». За амаль паўтара дзесятка гадоў вылічальная база універсітэта значна пашырылася. На сённяшні дзень інфармацыйна-вылічальны цэнтр ГДУ мае яшчэ дзве ЭВМ «Мір-2», па адной ЭВМ ЕС-1022 і СМ-4. Практычна выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта забяспечаны амаль усімі тыпамі вылічальнай тэхнікі.

Якасна ўзрос і аб'ём работ, якія цяпер выконвае ІВЦ. Інжынеры-матэматыкі, аператары абслугоўваюць 14 падсістэм АСУ. Сярод іх: «Налічэнне заработнай платы супрацоўнікам універсітэта», «Стыпендыя», «Улік матэрыяльных каштоўнасцей» і інш. Добрасумленна спраўляюцца са сваімі абавязкамі матэматыкі Н. Максіменка, Л. Пакаташкіна, А. Вішанкова, Р. Парамонава, аператары А. Салава, І. Шчадравіцкая, З. Зубарава і інш.

Значныя паслугі аказвае вылічальны цэнтр выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, і ў першую чаргу, кафедрам радыёфізікі, тэарэтычнай фізікі, інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі, вылічальных машын і праграмавання, грамадзянскай абароны, кафедры фізічнага выхавання. Асобна трэба выдзеліць кафедру матэматычных праблем кіравання і навукова-даследчую лабараторыю сістэмнага праграмавання, якія ўзначальвае кандыдат тэхнічных навук І. В. Максімей. У НДЛСП працуюць звыш 30 прафесіянальных праграмістаў, якія рашаюць задачы сістэмнага праграмавання, што паўстаюць, у прыватнасці, і перад нашым ІВЦ. Гэта задачы павышэння эфектыўнасці выкарыстання вылічальнай тэхнікі, ўліку эксплуатацыі тэхнічных сродкаў ЭВМ у рэжыме калектыўнага карыстання.

Адной з падсістэм, здольнай рашаць такія задачы, з'яўляецца ДКК — дыспетчар калектыўнага карыстання, распрацаваны НДЛСП і ўжо амаль год эксплуатуемы на ІВЦ.

Трэба адзначыць, што за кошт эфектыўнай арганізацыі выкарыстання вылічальнай тэхнікі ўдалося забяспечыць дастатковай колькасцю машыннага часу дзяржбюджэтныя і гаспдагаворныя тэмы. І гэта пры тым, што на сённяшні дзень максімальны тэрмін абслугоўвання студэнцкіх работ скараціўся да 10 гадзін.

Пачаліся работы па выкарыстанню дысплейнай тэхнікі ў працэсе навучання студэнтаў. Піянерамі ў гэтай справе сталі супрацоўнікі НДЛСП Г. І. Русава і Л. С. Ганчар, дыпломнікі якіх першымі сярод студэнтаў пачалі працаваць з дысплеямі, а таксама Г. Уздоўская і Г. Каморнікава, якія ўжо правялі першыя групавыя заняткі ў дысплейным класе.

За амаль 15 гадоў свайго існавання інфармацыйна-вылічальны цэнтр правёў значную работу і дасягнуў пэўных поспехаў. Асабліва прыкметны якасны рост узроўню работы ІВЦ за апошні год. Гэта звязана і з умацаваннем партыйнай арганізацыі, і паляпшэннем кіраўніцтва ІВЦ. У наш калектыў уліліся камуністы Л. П. Трацэўскі, які стаў выконваць абавязкі начальніка інфармацыйна - вылічальнага цэнтра, інжынер А. Д. Ложкін. Калі гаварыць аб нашых дасягненнях, нельга не адзначыць і тых, чыёй працай забяспечваецца штодзённая гатоўнасць вылічальнай тэхнікі. Гэта інжынеры М. Глазырын, І. Мартынаў, Л. Дзенісоўская, Н. Бухвостава, М. Цурганаў, А. Косцікаў.

Ёсць у нас і свае цяжкасці, вырашыць якія мы не можам нават з дапамогай кіраўніцтва універсітэта. ІВЦ патрэбна новае прыстасаванне, якое стабілізуе напружанне для сілкавання ЭВМ ЕС-1022. Часта на ІВЦ падлічваецца задача на працягу 2—3 гадзін запар. Калі ў гэты момант адбываецца кідок сілкуючага напружання, то машына адключаецца. Задачу трэба пералічваць спачатку — гэта адна-дзве і больш гадзін страчанага часу. Акрамя таго, у час такіх кідкоў напружання нярэдка выходзяць са строю тэхнічныя сродкі — дысплеі, дыскаводы і нават аператыўная памяць. Таму пытанне аб набыцці неабходнага нам прыстасавання стаіць вельмі востра.

З лістапада мінулага года ІВЦ поўнасцю перайшоў на работу ў аперацыйнай сістэме з пераменным лікам задач. Гэта сістэма дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць вылічальную тэхніку. Аднак ёсць яшчэ ва універсітэце супрацоўнікі, якія не хочуць навучыцца працаваць па-новаму; перарабіць нешта ў



сваіх старых праграмах. Вось яны і трымаюцца за дыскавую аперацыйную сістэму. Гэта датычыцца кафедр радыёфізікі, вылічальных машын і праграмавання, ТСАЭІ. Такое становішча неабходна выправіць як мага хутчэй.

Інфармацыйна - вылічальныя цэнтры Мінвуза БССР дзеляцца на дзве катэгорыі: 1-ю і 2-ю — у залежнасці ад выконваемага аб'ёму работ. Наш ІВЦ адносіцца да другой катэгорыі, але па аб'ёму работ мы ўжо выйшлі на 1-ю катэгорыю. Гэта дазваляе адміністрацыі ГДУ ва ўстаноўленым парадку вырашыць пытанне аб пераводзе нашага ІВЦ у новы статус. Аднак штатны расклад на ІВЦ застаецца неўпарадкаваным і на сённяшні дзень. Мы маем 5 ЭВМ, а штаты ёсць толькі на дзве: «Мінск-32» і ЕС-1022, прычым на апошнюю яны ўрэзаны. А машыны «Мір-2» і СМ таксама патрабуюць «інжынернага вока» і аператараў. Цяпер жа ў нас гэтыя машыны абслугоўваюць людзі, якія лічацца ў штаце «Мінск-32». Такое становішча стварае дадатковыя цяжкасці для падтрымання вылічальных машын у рабочым стане.

Кіраўніцтва ІВЦ арыентуе калектыў на новыя поспехі і дасягненні. Наладжаны творчыя сувязі з буйнейшымі ВНУ краіны — Ленінградскім дзяржуніверсітэтам, БДУ імя У. І. Леніна, Беларускім політэхнічным інстытутам і інш. У перспектыве — атрыманне новых праграмных сродкаў, якія будуць забяспечваць павышэнне прадукцыйнасці працы праграмістаў, паляпшэнне вучэбнага працэсу. Вялікія надзеі ў паляпшэнні абслугоўвання карыстальнікаў мы звязваем з атрыманнем новай тэхнікі: ЭВМ ЕС-1035 і СМ-4.

Калектыў ІВЦ паспяхова спраўляецца са сваімі задачамі і як падраздзяленне універсітэта імкнецца аказваць істотную дапамогу супрацоўнікам і студэнтам ГДУ ў навуковай і вучэбнай рабоце.

**М. ДАЛІНСКІ,**
**старшы інжынер-матэматык ІВЦ.**

**НА ЗДЫМКАХ: 1. Адна з лепшых аператараў ІВЦ Зінаіда Зубарэвіч (злева) і аператар Наталля Шпякіна праводзяць апрацоўку студэнцкіх работ на ЭВМ ЕС-1022. 2. У зале студэнцкага інфармацыйна-вылічальнага цэнтра. Вядуцца работы на дысплеях СМ-4.**

Фота А. Карніенкі.

*Перадавы вопыт—у вучэбны працэс*

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ДЗЕЛАВЫХ ГУЛЬНЯЎ

У цяперашні час педагогі горача спрачаюцца: прымяняць ці не прымяняць дзелавыя гульні ў вучэбным працэсе пры навучанні студэнтаў стацыянара? Скептыкі лічаць, што калі студэнты дрэнна рыхтуюцца да семінарскіх і практычных заняткаў, то прымаць актыўны ўдзел у гульні яны наогул не здольны. Аднак энтузіясты, не звяртаючы ўвагі на спрэчкі, паспяхова гуляюць і сумесна са студэнтамі асвойваюць праблемныя пытанні сучаснасці па канкрэтных дысцыплінах і на стыку навук.

На наш погляд, усе гульні трэба раздзяліць на строгія, дзе вытрымана паслядоўнасць прыняцця рашэння, разлікаў і канечны вынік прадстаўляе сабой аптымальны варыянт выбару параметраў па наперад зададзенай методыцы, і эўрыстычныя, у якіх канчатковы варыянт рашэння прымаецца пасля «мазгавога штурму» удзельнікаў умоўных структурных падраздзяленняў прадпрыемства.

Вучэбна-вытворчая гульня «Эфектыўнасць арганізацыі і нарміравання працы» (ЭАНП), якую мы прагулялі сумесна са студэнтамі дзвюх груп IV курса спецыяльнасці 1704 Кіеўскага інстытута народнай гаспадаркі, адносіцца да эўрыстычных. Гэта комплексная вучэбная гульня, якую можна прагуляць у 15 варыянтах у залежнасці ад ступені дэталізацыі вытворчай інфармацыі. Гульня дазваляе ўдакладніць і замацаваць веды па курсах «Планаванне народнай гаспадаркі», «Навуковая арганізацыя і нарміраванне працы», «Эканоміка працы», «Аналіз працоўных паказчыкаў». Гульня накіравана на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, стварэнне стымулюючых умоў для паглыблення прафесіянальных ведаў і развіцця творчых здольнасцей студэнтаў. Вучэбны матэрыял у працэсе гульні засвойваецца студэнтамі ў значнай ступені самастойна, шляхам аналізу і ацэнкі рэальнай сітуацыі, метадам спроб і памылак.

Выкладчыкі, якія прысутнічаюць на гульні, уключаюцца ў ігравыя групы і даюць неабходныя кансультацыі. Пры гэтым здзіўляе раскаванасць зносін студэнтаў з педагогамі. Адсутнічае боязь за няправільны погляд на прадмет даследавання, педагогі карэктыруюць веды без даўлення сваім аўтарытэтам. Групы працуюць як калектывы з добрым псіхалагічным кліматам. Ранжыраванне па ролях ідзе хутка, кожны заняты сваёй праблемай, шукае адказ у «інфармацыйных папках», «бібліятэцы», якую падрыхтоўваюць для студэнтаў лабаранты кафедры, кансультуюцца ў любога выкладчыка за межамі вучэбнага класа. ЭАНП вучыць сумеснымі намаганнямі дабівацца лепшага выніку, здольнасці працаваць у калектыве, улічваючы інтарэсы кожнай функцыянальнай групы і асобнага ўдзельніка гульні.

На гульню адведзена 26—28 гадзін, з іх 8 гадзін лекцыйнага часу, 10—12 гадзін самападрыхтоўкі, Гульня праводзіцца ў адзін дзень на працягу 8 гадзін па раскладу вучэбнай часці. Метадычныя рэкамендацыі да гульні ў аб'ёме 85 старонак утрымліваюць неабходныя палажэнні, методыкі разлікаў, формы статсправаздачнасці, прыклады афармлення дакументаў, якія прымяняюцца ў вытворчасці і дазваляюць да канца гульні кожнай функцыянальнай групе скласці справаздачу аб зробленым з прапановамі па ўдасканальванню арганізацыі і стымулявання працы на аб'екце. Паколькі размеркаванне роляў адбываецца за 10—12 дзён да гульні, то кожны яе ўдзельнік ужо ўнутрана сабраўся рашаць пытанні ў межах сваіх абавязкаў. «Штаб гульні» ажыццяўляе кантроль за падрыхтоўкай групы да гульні. На гульню група прыходзіць з «нагляднай агітацыяй» па прапанаванай тэме (выказванні вядомых людзей па прадмету, шаржы, карыкатуры, заклікі і г. д.).

Спачатку студэнты вывучаюць інфармацыю, атрыманую ад педагога, рыхтуюцца да «вытворчага сходу». Ён праходзіць актыўна, выступае кожны ўдзельнік гульні, вядуцца пратаколы сходу.

Здзіўляе высокі творчы ўздым групы. умение правільна размеркаваць службовыя ролі, уключыцца ў працу, да канца гульні выдаць справаздачу аб удасканальванні работы канкрэтнай брыгады з мерапрыемствамі для ўсіх структурных падраздзяленняў.

Па выніках гульняў у патоку вызначаецца група-пераможца спаборніцтва на «ЭАНП», якая атрымлівае дазвол рэктарата і дэканата на датэрміновую здачу экзамена па курсу «НАП у прамысловасці». Акрамя таго вызначаецца «Лепшы начальнік цэха», «Лепшы начальнік аддзела працы і заработнай платы», «Лепшы начальнік лабараторыі НАП», «Лепшы брыгадзір» і г. д.

Вынікі спаборніцтва па «ЭАНП» падводзяцца ў прысутнічанні ўсіх студэнтаў курса.

На наш погляд, гэты від актывізацыі пазнання дае вялікі эфект, таму што «мазгавы штурм» па актуальнай праблеме застаецца ў памяці на ўсё жыццё, як працоўны дзень спецыяліста, арганізаваны на аснове навуковай арганізацыі працы. Таму дзелавыя гульні павінны замяніць частку практычных заняткаў з мэтай комплекснага пазнання праблемных пытанняў па кожнаму курсу.

У нашых выкладчыкаў ёсць рэальныя магчымасці для распрацоўкі і правядзення такіх гульняў, таму што ўжо 10 гадоў кафедра падтрымлівае цесныя сувязі з прамысловымі прадпрыемствамі Гомельскай вобласці і на абмеркаванне студэнтам можна прапаноўваць канкрэтныя вытворчыя сітуацыі.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**Т. ІВАНОВА,**
**старшыя навуковыя супрацоўнікі кафедры эканомікі працы.**

